# ВЯСКОВЫЯ МОГІЛКІ

# №18 МЕНСК 2002



# А говорили: нужна операция...

**предприятие ЭкспоГран**

Налетай подешевело!!!

**ПРЕДЛАГАЕТ:**

**БЕРИ СЕЙЧАС – ДЕШЕВЛЕ УЖЕ НЕ БУДЕТ !!!**

**ПО САМЫМ НИЗКИМ ЦЕНАМ В БЕЛАРУСИ**

**Любые ПАМЯТНИКИ разных форм, цветов, размеров. На Северном кладбище установка БЕСПЛАТНО. ДО 28 ФЕВРАЛЯ – СКИДКА до 10%!**

[illegible]вонитe прямо сейчас: 504 83 49, 8-029 627 55 52.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Тел 504 83 49 8-0296275552 | [illegible] | Тел 504 83 49 8-0296275552 | Тел 504 83 49 8-0296275552 | Тел 504 83 49 8-0296275552 | Тел 504 83 49 8-0296275552 | Тел 504 83 49 8-0296275552 | Тел 504 83 49 8-0296275552 | Тел 504 83 49 8-0296275552 | Тел 504 83 49 8-0296275552 | Тел 504 83 49 8-0296275552 | Тел 504 83 49 8-0296275552 [illegible] |



## ВЯСКОВЫЯ МОГІЛКІ

№ 18
жнівень 2002

Рабілі гэты нумар, елі цукеркі і пілі піва –

*Ленін і Джэці,*

яны ж рэдакцыя,

вельмі ўдзячная тым,

хто пісаў і хто будзе

чытаць тое, што яны ў

рэшце рэшт выдалі.



**РАБОТАЕМ ДЛЯ ПИОНЕРОВ И ДЛЯ ПЕНСИОНЕРОВ**




Праваднік [X]


- Рабочы стол
  - Мой кампутар
    - Дыск 3,5 [A:]
    - [D:]
    - [C:]
      - Program Files
      - Windows
      - Мае дакумэнты
        - Проза
          - Алег Кірыла. Ліса Паганкіна жрэ Заходні Полюс — 6
          - Петя. В преемственности поколений—сила будущего — 8
        - Паэзія
          - Вінцук Адвячорка "Падабаюцца мне галубыя..." — 11
          - Віктар Ываноў
            - "А сапраўдныя вершы? Няма. Як карэньне..." — 11
            - "Любі сваю айчыну..." — 11
            - "Вось вам, глядзіце, мужчынскі партрэт..." — 11
          - Віктар Жыбуль. "Забітыя дошкамі вокны..." — 12
          - Джэці. Дыянызійская філязофія — 12
          - Вика Трэнас. О том, что мне не принадлежит — 12
          - Hydrocyanic. Индустрия 2.0 — 13
          - Лана Берасцянская
            - Про кошку и блошку — 13
            - "Ляцела восень за аблокі..." — 13
            - "Калі паклікалі сардэчна..." — 13
        - У сьвеце прыгожага — 14
        - Старонка крытыка
          - Сяргей Трунін. Паэтызацыя брутальнага ў творчасці Васіля Фірхольда (на матэрыяле зборніка "Я дзеўка") — 16
  - Старонка-інтэрнат — 18
  - Сьметніца




*ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!*

*Мы рады ў чарговы раз запрасіць вас у чароўны сьвет паэзіі, прозы, драматургіі, жывапісу, графікі, скульптуры, дойлідства, разьбярства і мастацтва наогул – асабліва калі вы ведаеце, як у гэты сьвет патрапіць, бо мы сумняемся.*

*Вы, напэўна, заўважылі, што ў нас трошкі зьмянілася назва. Гэта сьведчыць пра пераход часопіса ў новае вымярэньне, настолькі новае, што невядома чаго. На шчасьце, вымярэньне і выміраньне – гэта крыху розныя рэчы, тым больш, што могілкам вымерці ўвогуле цяжка, а таму пасьля пераўсталяваньня віндзы, офіса, нэту (не якога зусім нэту, г.зн. няма, а ІНТЭРнэту – ці паміжняма) і іншых карысных рэчаў мы нарэшце перазагрузіліся, і вось мы з вамі зноў. Каб прачытаць тэкст далей, падключыце CD-rom, мадэм, друкарку, джойстык, сканер і націсьніце OK. А калі ў вас усяго гэтага няма, то нічога вы далей не прачытаеце, хіба што вы ну вельмі прасунуты хакер або робіце сідзіромы з паветра. Ну, то посьпехаў вам!*



*Рэдакцыя.*




Не пужайцеся! Гэта застаўка.
Пасуньце мышку трошкі ўбок
або перагарніце старонку.
OK

*Гэта заканчэньне. Пачатак і працяг – у двух папярэдніх нумарах.*

Алег КІРЫЛА

# ЛІСА ПАГАНКІНА ЖРЭ ЗАХОДНІ ПОЛЮС

Я тут пра экспядыцыю, як вы памятаеце, сказаў слова...

У яе, уласна кажучы, ехала не сама Ліса, а мама. Лісу з сабою браць невыгодна – усё пажрэ дый ад холаду памрэ.

А толькі зрабілі ў школе нечакана карацін. Выходзіла, што дзяўчынка будзе хадзіць без дагляду... НЕПАРАДАК!

Спачатку ўсе ехалі ў Курбастан, адкуль пешшу на палярную мытню, дзе чакаў усюдыход.

Сталіца Курбастану Стабаркун была горадам, у якім крадуць усе й усё, але ніякіх законаў на гэты конт не існуе. Там нават у газэтах публікуюць абвесткі кшталту «У мяне ё кампутар Macintosh. Прашу ТЭРМІНОВА ўкрасьці».

А замест крамаў там склады, адкуль усе ўсё проста так бяруць.

І вось прачынаюцца ў гатэльным нумары нашыя гяроі, а адтуль за ноч нават шпалеры сьперлі...

А, яшчэ, курбасы – гэта тыя-ж барсукі, толькі на задніх лапах ходзяць ы па-расейску гавораць. І сьнежкі шпурляюць віртуёзна.

Таму ня дзіва, што прыйшоўшы на мытню, Ліса не адмарозіла толькі кавалачак пазногця. Усё астатняе ёй на месцы ампутавалі.

Усюдыход быў машынаю з вокладкі «Тэхнікі – моладзі» ці то 1'959, ці то 2'959. Там яшчэ быў пра яго здаровы артыкул.

Але на полюсе, на які ехалі, маразы былі значна мацнейшыя й дасягалі чатырохсот градусаў. Адпаведна з гэтым ы дапрацавалі машыну.

Пакуль дапрацоўвалі, Ліса выпіла палову саляркі.

Весела ехаць на дапрацаваным усюдыходзе! Вакол зіма градусаў трыста, усё жывое мерзне на ляту, паветра звадкавалася й вісіць туманам, а табе амаль што цёпла... Гарбата – кіпень, а паднясеш да форткі – й адразу зь лёдам.

Лісе далі транквілізатар, каб нічога ня зьела, і абяцалі абудзіць на полюсе. Добра спаць усюдыходзячы – сьпіцца як у цягніку!

Полюс адразу бачны. Туды столькі сьцягоў панатыркалі!

– Ну, дачурка, – кажа мама Рыма. – Глядзі на Заходні полюс.

Выходзяць палярнікі на сьвежае паветра – хораша пасьля кандыцыяванага! Утыркаюць нашыя сала-мяса-сала ды праверку на дальтанізм.



Тут Ліска падыходзіць — ГАМ! — і адкусвае з добры кубамэтар зямлі. Той самай, на якой сьцягі. Вядома, разам зь імі.

Так што няма болей Заходняга полюса.

І тут рухавік забіўся ў сутарзе ды здох.

Гэта канец. Лісе млосна, яна пачала паволі асядаць. Потым пальцы ў рот — і на сьнезе раптам зьявілася лужына саляркі, якая тут-жа й замерзла. Яе (хоць цяпер ы няякасную) адкалупалі й закідалі ў бакі.




А Лісе зусім чамусьці дрэнна. Ванітавацца хочацца, але няма чым. Хапае ротам паветра, вось апошні раз схапіла й памерла. Цьвёрдая зрабілася, халодная, зазьвінела. Доктар кажа клінічная сьмерць. Лячыць трэба!

Так увесь каранцін ы праляжала дома на канапе, ніякае ад яго радасьці. Добра хоць трызьніла.

Але каранцін падоўжылі, і вось тут Ліска адарвалася.

А яшчэ ў яе некалькі месяцаў была звычка казаць усім:

—Ня пі салярку на марозе! Ня пі салярку на марозе!

Ад яе з-за гэтага зьбеглі чатыры хлопцы.

Адзін, праўда, вярнуўся. Гэта быў Міша Галадухін. І яшчэ адзін вярнуўся, гэта быў Аляксандра.

Яны здалі іспыты пасьля 9й клясы й паехалі ў другую экспэдыцыю, аднаўляць Заходні полюс.

Яе Ліса памятае лепей. Буду ў яе, абавязкова спытаю, а зараз баюся схлусіць. Дый спаць пара, заўтра падымацца а 8ай.

Ну вось ы паспаў. На чым я там спыніўся?

Не, у Лісы мяне пакуль не было. Таму я пакуль ня буду пра экспядыцыю, а напішу лепей, чаму Ліса зрабілася такою.

Дык вось. Ліска нарадзілася, а праз тыдзень кудысьці зьнік бацька, прыхапіўшы Барыса.

А малака ў маці было небагата, і ўвесь час трэба было яго купляць.

Аднойчы на яе наехалі мянты й замялі ў мянтоўку. А мабільнікі тады былі толькі ў самых новых рускіх. І праляжала Ліса 1на ўсе 15 сутак. За гэты час яна зьела палову мэблі.

Ну вось, уласна кажучы, й усё.

*Этот рассказ был написан и сдан в качестве сочинения на торжественную тему на журфаковских подготовительных курсах. Реакцию преподавательницы можно увидеть в самом конце. Не очень она мне нравится, впрочем, дорогие читатели, решайте всё для себя сами. А тема всё-таки раскрыта—и ещё как!—закачаетесь! Очень хотелось сохранить авторскую орфографию, но удалось это только местами. Зато стилистическую правку мы решили не делать. Ну её! Нам и так нравится.*

***ПЕТЯ***



## В ПРЕЕМСТВЕННОСТИ ПОКОЛЕНИЙ – СИЛА БУДУЩЕГО

Яркий зал музея "Антропологии" был переполнен. Такого количества посетителей не было даже на торжественном открытии. Причиной стало появление двух новых экспонатов, о которых уже не первый день говорили все телевизионный каналы новостей. Специально по этому случаю был сделан рекламный ролик, рассчитанный на категорию населения, игнорирующую просмотр информационных передач.

Реклама была примерно следующей. На фоне сочно-зелёных джунглей стоял толстенький красный человечек, одетый в форму цвета хаки. Он с большим увлечением рассказывал о теории происхождения вымерших видов, каким-то странным образом проводил параллели с экологией. Он приглашал всех, кто хочет узнать об этом подробнее, в музей "Антропологии".

--А также!--радостно кричал человечек, отмахиваясь от жужжащих вокруг москитов,--первые пятьдесят посетителей пройдут абсолютно бесплатно и получат в подарок фирменную майку с логотипом музея.

Реклама была глупой, но по количеству посетителей, которые продолжали прибывать, становилось понятно, что ролик оказал положительное действие.

Весь зал с высокими мраморными колоннами, упиравшимися прямо в свод кристально-прозрачного стеклянного потолка, был украшен яркими лозунгами. На одних большими ярко-оранжевыми буквами было написано:

ЛИШЬ ВЗАИМОПОНИМАНИЕ НЕ ВЕДЁТ К РАЗРУШЕНИЮ

на других более мелкими зелёными:

ЛИЧНЫЕ ВЫСКАЗЫВАНИЯ О МИРОЗДАНИИ И ПРЕЕМСТВЕННОСТИ ПОКОЛЕНИЙ ВЕДУТ К ОБЩЕМУ НЕПОНИМАНИЮ И ХАОСУ

Но чаще всего встречались огромные серые стенды с красными выпуклыми буквами, гласившие о том, что

ПОНИМАНИЕ ЕСТЬ ПУТЬ К СОВЕРШЕНСТВУ

"А совершенство,—подумал Артур,—не знает границ..."

Артур Ластмэн стоял в стороне, пытаясь спрятаться от яркого света ламп. Артур был облачён в чёрную мантию с красной шёлковой каймой. Лицо скрывала тень капюшона. Его наряд настолько не гармонировал с собравшейся фрачной публикой и был настолько пропитан древностью, что Артур напоминал шаолиньского монаха, перепутавшего залу современного музея с античным храмом Будды. Пытаясь таким образом скрыть свою внешность, Ластмэн вызвал большой интерес у охраны, давно наблюдавшей за ним. Артур заметил усиленное внимание со стороны секьюрити, относящееся, безусловно, к нему. Раскрыв буклет, бережно выданный при входе, Артур решил сохранять непоколебимое спокойствие и начал читать.

***<u>Профессор пространственных наук Н.Н.Болл.</u>***

***<u>Теория жизни как существование отдельных энергетических субстанций</u>***

***Жизнь состоит из множества переплетающихся нитей- обстоятельств, одним концом уходящих в бесконечное энергетическое пространство огромного светящегося шара, а другим каждая из нитей примыкает к своему собственному маленькому шарику-субъекту. Такой шарик является накопителем периодического заряда. Он усеян***

***огромным количеством тоненьких светящихся волосков, дающих возможность соединения с другими накопителями. Связь накопителей приводит к соединению двух нитей и образованию нового шарика (см. рисунок-b). Далее происходит так называемое "free absorption" (свободное поглощение). Поскольку заряд соединившихся шариков-субъектов истощён, они всасываются в энергетическое пространство, где перезаряжаются. Это явление называется "second existence" (дословно как "второе существование"). Оно может происходить несколько раз, при этом нить обстоятельств постоянно удлиняется. Чем длинней она становится, тем легче шарику сорваться. При разрыве субъекта и нити-обстоятельств (нить при этом перестаёт существовать) начинается постепенная потеря заряда. Шарик меркнет, пока не исчезнет вовсе. Но, как известно...***

Внезапно чтение прервал низкий голос.

—Вы есть кто? Документы можно посмотреть ваши?—отрывистым басом прогремело над головой Ластмэна. Он поднял голову и увидел перед собой грозное лицо охранника. Охранник появился так неожиданно, что Ластмэн даже выронил буклет и замер в оцепенении.

—Вы есть кто?—повторил охранник, явно начинавший злиться.

—Я есть... ммм... понимаете, я профессор пространственных наук Ластмэн,—неожиданно для себя выпалил Артур.

Охранник недоверчиво посмотрел на Ластмэна, а наверно, всё-таки собирался потребовать документы, но свет внезапно погас, зазвучала торжественная музыка. Возвышавшийся в центре зала подиум осветили многочисленные рампы. Ластмэн направил взор прямо в пол и, осторожно обойдя замешкавшегося охранника, начал пробиваться сквозь толпу, пытаясь как можно ближе приблизиться к сцене. Ему казалось, что тяжёлая рука опомнившегося охранника настигнет его и потащит в опорный пункт, где после лазерного сканирования наступит смерть. Но этого не произошло, и ватная пустота, образовавшаяся в суставах, постепенно начала рассасываться. Стало легче, и Ластмэн понял, что может остановиться.

Когда Артур окончательно пришёл в себя после испуга, то заметил, что находится прямо возле сцены, на которой возвышалось "нечто" правильной кубической формы, накрытое плотной блестящей тканью. "Экспонаты",—догадался Ластмэн.

В это время на сцене появился маленький человечек с большой головой и чёрными бездонными глазами. Ему тут же дали микрофон, и тихим голосом он начал свою немного рваную от волнения речь.

—Дорогие наши посетители!—говорил человечек, радостно размахивая свободной от микрофона ручкой.—Сегодня, как вам известно, большой праздник. Ровно десять лет тому назад был достроен и приступил к своему полноценному функционированию первый город на этой чудной зелёной планете. Но она не всегда была прекрасной. До нас, как вам известно, на ней жили, можно сказать, примитивные существа, которые не ценили и не умели использовать всю силу данной планеты. Они разрушили весь её природный потенциал, мотивируя тем, что "нуждаются в ресурсах существования". Они возводили огромные города, переполненные загрязняющими окружающую среду средствами передвижения. Рядом с городами строили такие же огромные заводы, выделяющие вредные токсичные выбросы прямо в атмосферу. И, надо сказать, это вредило по большей части им самим, потому как все выбросы висели прямо над городами.

Эти существа ненавидели друг друга. Да-да, вы не ослышались. Именно ненавидели. Затевая ненужные, ни к чему не приводящие войны, они уничтожали себе подобных, что уж

совсем недопустимо. Но, к счастью, все они вымерли, так и не успев разрушить Землю до основания.

Как показали исследования одного из наших учёных, одной из главных причин их скоропостижного вымирания стало нарушение преемственности поколений. Оно вызвано постоянным непониманием. Непонимание способствовало появлению других факторов: злобы, жадности, зависти. Всё это привело к необратимому разрыву связи поколений. Одним словом, они не сумели правильно воспользоваться счастьем их существования и погубили сами себя...

В этот момент ткань, накрывавшая “нечто”, взмыла к потолку, и белый свет рамп упал на огромный стеклянный куб, наполненный жидкостью. Внутри куба плавно, как в невесомости, плавало два окоченевших человеческих тела.

—Это наглядный пример. Отец и его сын!—возбуждённо кричал человечек.—Связь между ними, как и связь между другими индивидуумами, была нарушена! Они сформировались как личность, придерживаясь основных взглядов эпохи, в которой были рождены! Собственно, это и приводило к непониманию между ними. В связи с этим можно сказать, что лишь в преемственности поколений—сила будущего.

Ластмэн больше не слушал речь мерзкого человечка. Его виски больно сдавило, голова закружилась, стало тяжело дышать. Артур понял, что сейчас потеряет сознание, и поспешил покинуть зал.

Выйдя на улицу, Ластмэн глубоко вдохнул экологически чистый воздух. “Связь поколений разной эпохи, нарушение связи и экологии, война, уничтожение,—думал он.—А ведь этот гадкий гуманоид с чёрными бездонными глазами, в которых нет ни намёка на жизнь, несомненно, прав”. От этой правды у Ластмэна больно защемило сердце. На душе стало отвратительно горько, слёзы наполнили его глаза. Он опустился на землю и поднял голову вверх. В чёрной пустоте космоса ярко горели звёзды...

Рассказ интересный, но ис-
пользовать его в качестве со-
чинения не советую. Стиль...
Много ошибок...
Попробуем написать ещё
что-нибудь!



*А откуда у нас взялись эти тексты – БАААЛЬШОЙ СЕКРЕТ!*

## ВІНЦУК АДВЯЧОРКА

* * *

Падабаюцца мне галубыя,
Яны проста ня маюць праблем,
У іх усе разгаворы прастыя
І няма забароненых тэм.

Ні свякрухі няма ў іх, ні цёшчы,
Ні агульных (ці общчых) дзяцей,
Вось таму і жывецца ім прошчэ,
А часамі дык нават прасцей.

Хай крычаць, што яны не такія,
Не сапраўдныя, мол, мужыкі...
Падабаюцца мне галубыя,
Мне шкада, што я сам не такі.

## ВІКТАР ЫВАНОЎ

* * *

А сапраўдныя вершы? Няма. Як карэньне
Пустазельля, яны засталіся ў зямлі.
Толькі пальцы цяпер у зялёным варэньні,
Быццам рукі (што ў кроў); +, вядома, патэльню
(3-пад натхненьня) гарачай вадой залілі.

* * *

Любі сваю Айчыну колькі ўлезе

* * *

Вось вам, глядзіце, мужчынскі партрэт:
Высокі, вусаты, санет, трыялет,
Чарка і скварка. Шчэ б рыфму да Фаніпаля
І быў бы лякальны паэт.
Хаджу па прашпэкце. Паэму ўзначаліў.
Вусы (бо ўжо надта яны заміналі
Хадзіць) пагаліў. Нўа рыфму да Фаніпаля
Абяцалі ў наступным квартале,
Ім жа – катрэне. Паэму – ужо...
– Слухай! вось табе рыфма да Фаніпаля,
Рыфмуй колькі ўлезе. Я ж памятаю,
Адно да яе па прашпэкце ішоў...
– Уй! Асанансы! Уььй!
Я зараз ад ых званітую!
Людзі! нармальную рыфму да Фаніпаля́,
ня гэтую, а вунь тую!

Віктар ЖЫБУЛЬ

* * *

Забітыя дошкамі вокны
панура глядзяць на мяне.
Прыстанішча плямінаў мокрых
на шэрай аблезлай сьцяне.

Няма электрычнасьці, газу,
і можна адкінуць канькі,
бо ўсюды разносяць заразу
пражэрлівыя пацукі.

А побач стаіць прыбіральня —
з вакенцам, але безь дзьвярэй.
Разьбіты ліхтар асьвятляльны.
Сабака ганяе курэй.

Дарога — як брудная каша
пад коламі ржавых машын.
І з бразгатам шклянак і пляшак
заселі ў кустах алкашы.

Між дрэваў — вяроўка худая.
Пялёнкі на ёй ды трусы.
Такі краявід нараджае
паэзію чыстай красы.




ДЖЭЦІ

ДЫЯНЫЗІЙСКАЯ ФІЛЯЗОФІЯ

На тонкай лёсачцы,
Зь нябёсаў спушчанай,
Гайдаўся Гайдэгер
Напаўраструшчаны.

А побач Крысьцева
Сухое лісьціва
Нагамі крэсьліла —
Шукала крэсіва.

На белым прапары
Напаўразгаданы
Драмаў падрапаны
Пабіты Гадамэр,

А Фэйербах лавіў
Іх у траве
І фэйербахаў іх
Па галаве.

А Ніцшэ зьнішчыў іх
І перабіў,
Засумаваў і новых
Нарабіў.




ВИКА ТРЭНАС

О ТОМ, ЧТО МНЕ НЕ ПРИНАДЛЕЖИТ

В нелепости разбитых стёкол
Моя душа насквозь промокла
от фиолетовой гуаши
Следы остались — наши, наши...
но в перевёрнутом абсурде
классических стихов не будет
измазавшись в кровавой каше
я становлюсь всё краше, краше...






HYDROCYANIC

ИНДУСТРИЯ 2.0

НА ВЕРТИКАЛЬНЫХ направляющих стойки два
с возможностью ОСУЩЕСТВЛЕНИЯ
ПОСТУПАТЕЛЬНО-ВОЗВРАТНОГО движения
салазки ПЯТЬ

НА КОТОРЫЕ КРЕПИТСЯ шлифовальная бабка шесть
содержащая привод ШПИНДЕЛЯ СЕМЬ
ШЛИФОВАЛЬНОГО КРУГА
ИНОГДА СТОЛЫ ЧЕТЫРЕ
выпускаются с возможностью НЕБОЛЬШОГО НАКЛОНА
ТРИ-ДЕСЯТЬ градусов
для шлифования ВНУТРЕННИХ КОНУСОВ
ВЫПУСКАЮТСЯ ТАК же станки
с подвижными СТОЙКАМИ ДВА
ПОЗВОЛЯЮТ ВЕСТИ обработку отверстий
в весьма тяжёлых деталях

ТАК ВОТ ЧЕМ СВЕРЛЯТ дырки в унитазах




Всё напечатает на свете
Спец. ред. кор., она же — Джеци.

*Так вот как вы обо мне думаете? Ну что ж, получайте!*

ЛАНА БЕРАСЦЯНСКАЯ

* * *

Ляцела восень за аблокі
Пад моцны клёкат жураўлёў,
Кідала лістапад у змрокі,
А разам — клікала буслоў.
Калісь скуголіла дажджамі,
Калісь зладала наўздагон.
Ляцела восень за лістамі,
У зааблочны рэгіён.

ПРО КОШКУ И БЛОШКУ

Дремлет кошка у окошка,
Греет спинку и бочок,
Но зато не дремлет блошка —
По зверюшке скок да скок.
Ищет, видимо, местечко,
Где уютно и тепло,
Где еду нагрела печка —
То есть кошечки мурло.




* * *

Калі паклікалі сардэчна,
Ўладай сабой, ня будзь бяспечным,
Бяспеку свята збараняй —
У ложак з люлькай не лягай!



Мал. 1. П.А. Фядотаў "Пераборлівая нявеста"



**<u>У СЬВЕЦЕ ПРЫГОЖАГА</u>**

***Шаноўныя чытачы! Нам раптам захацелася паразглядаць розныя карціны. Калі вас прывабяць ксэракопіі іхніх рэпрадукцыяў, то далучайцеся.***

***Сёньня мы разглядаем тры карціны, дзе ЎСЕ КАГОСЬЦІ ЗА ШТОСЬЦІ ТРЫМАЮЦЬ. Гэта карціны славутых рускіх мастакоў Фядотава, Іванава і Рэпіна.***

***У першым выпадку, на карціне "Пераборлівая нявеста" (1847, мал. 1) пераборлівую нявесту трымае за руку гарбаты жаніх, які, вядома ж, на фіг ёй не патрэбны, але, напэўна, таксама мужчына, а тое чаго б ён да яе папёрся. Трымае ён яе за самыя пальчыкі, бо далей яму, напэўна, не дазваляюць. На другой карціне, "Прыам, які выпрошвае ў Ахілеса цела***



Мал. 2. Іванаў А.А. "Прыам, які выпрошвае ў Ахілеса цела Гектара".



Мал. 3. Рэпін І.Я. "Іван Грозны і ягоны сын Іван 16 лістапада 1581 года."

*Ге́ктара" (1824, мал. 2), Прыам захапаў у Ахілеса руку ажно па локаць, таму што Прыам не жаніх і не гарбаты, а Ахілес не нявеста і, відаць, ня надта пераборлівы. Але, зьвярніце ўвагу, пазірае на Прыама з гэткай жа прыкрасьцю, што й нявеста на гарбуна і, відаць, гэтак жа хоча аддаць цела Ге́ктара Прыаму, як тая цётка – выйсьці за гарбатага. На трэцяй карціне, "Іван Грозны і ягоны сын Іван 16 лютага 1581 года" (1885, мал. 3) абодва героі назаўсёды захрасьлі ў гэтым злашчасным дні, калі Іван Грозны праламаў галаву свайму сыну. За гэтую галаву ён яго і трымае, пакідаючы руку жаніхам і прыамам, ад якіх усё адно няма ніякой карысьці.*

*Цяпер зьвернем увагу на ПАБОЧНЫХ АСОБАЎ. У выпадку з жаніхом гэта нейкія дзядзька й цётка, якія, напэўна, чакаюць за дзьвярыма ў чарзе, каб таксама пазаляцацца да пераборлівай нявесты і да гарбуна адпаведна. У Ахілеса і Прыама другарадных асобаў таксама дзьве: напэўна, Ахілес, акрамя цела Ге́ктара, захоўваў у сябе яшчэ два нейкія целы. На карціне пра Івана Грознага пабочных асобаў няма. І гэта добра. Калі б яны былі, хто ведае, як павярнулася б гісторыя.*

*Цікавым мастацкім дэталям зьяўляюцца ВОКНЫ. У Ахіла акно вялікае і за ім нейкі краявід. Паколькі акно намаляванае, узьнікае падазрэньне, што яно несапраўднае і што за ім дзьверы ў тэатр. Але паколькі там і ўсё астатняе намаляванае, варта пагадзіцца з тым, што ўсё жыццё – гэта тэатр. У Івана Грознага акно маленькае, і за ім нічога не бачна. У нявесты вокнаў няма, затое ёсьць печка, куды можна выкінуць нялюбага жаніха, калі пад рукой аніводнага акенца.*

*Але яшчэ цікавей тое, што ПАКЛАЛІ НА ПАДЛОГУ тыя, хто нешта ў кагосьці абхапіў. У Івана Грознага гэта скіпэтр, якім цар праламаў сыну галаву. У Прыама гэта таксама скіпэтр, таму што Прыам таксама цар, і калі Ахіл не аддасць цела Ге́ктара, Прыам можа праламаць яму галаву. А ў жаніха ёсьць палачка, але які ж гэта скіпэтр? Тым больш, што ў нявесты пад рукой неблагі столік, з-за якога гарбун рызыкуе зрабіцца двухгорбым… У яго, дарэчы, там яшчэ цыліндр побач ляжыць, але такім капялюшыкам галаву дакладна нікому не праламаеш. Вось калі б у жаніха таксама быў скіпэтр, нявеста дакладна не была б такой пераборлівай.*

*Зьвяртаюць на сябе ўвагу КАЛЯРОВЫЯ ПЛЯМЫ, якія на ўсіх трох карцінах чырвоныя. На першай гэта сьцяна за сьпіной нявесты (ніхто ня ведае, што ў яго за сьпінай, акрамя тых, хто глядзіць яму ў вочы!), на другой – плашч Ахілеса (вычварэнец ён, што зь яго*

*возьмеш?), на трэцяй – кроў, якая цячэ з галавы Івана, сына Івана Грознага, у дзень 16 лістапада 1581 года. Ва ўсіх трох выпадках чырвонае не належыць тым, хто кагосьці за штосьці трымае. Цікавае супадзеньне!*

*І яшчэ. Паўсюль на згаданых намі карцінах скарыстаны прыём “малюнка ў малюнку” (ці бюста ў…ня ў бюсьце, не, дзякуй Богу, а зноў-такі ў малюнку, што тое ж самае). На сьценах у нявесты вісяць розныя рамантычныя дзяўчыны. Гэта прымушае думаць, што нявеста або фэміністка, або лесьбіянка; гарбуна шкада. У Ахіла гэта бюст – або продка або Гамэра, які, па сутнасьці, тады яшчэ не нарадзіўся. Значыць, гэта мусіць быць сам Зэўс. А ў Івана Грознага на сьцяне дакладна продак, толькі невядома, які, таму што яго дрэнна бачна.*

*З усяго, што мы сказалі, можна зрабіць ВЫСНОВУ, што кожны мае тых продкаў, якіх ён заслугоўвае, гэтак жа як і продкі маюць права на целы іхніх сыноў толькі пасьля вядомых маніпуляцый з царскім скіпэтрам, а каб наогул мець сыноў, трэба добра валодаць цыліндрам і не дражніць нявесьціну печку.*

*Усё.*



# СТАРОНКА КРЫТЫКА




СЯРГЕЙ ТРУНІН

## ПАЭТЫЗАЦЫЯ БРУТАЛЬНАГА Ў ТВОРЧАСЦІ ВАСІЛЯ ФІРХОЛЬДА (НА МАТЭРЫЯЛЕ ЗБОРНІКУ "Я ДЗЕЎКА")

Паэзія В. Фірхольда заўсёды вызначалася сваей адкрытасцю, грамадзянскай накіраванасцю. І зборнік "Я дзеўка" — не выключэнне. Ужо ў самым першым вершы, які адкрывае кніжку, адчуваецца моцны ўплыў транссэксуальнай паэзіі, найбольш вядомымі прадстаўнікамі якой з'яўляюцца Змітрок Прыгаў і Пятрусь Чырванапёраў. Але адначасова з гэтай традыцыяй у верш уключаюцца і нацыянальныя рысы: лірычная гераіня нездарма ўзгадвае Цётку — нацыянальную беларускую паэтку. Таксама вельмі шырокі культуралагічны кантэкст верша: узгадваецца Э. М. Рэмарк; маразматычкі крычаць: *"Дурная дзеўка, як мужык!"*, што з'яўляецца трансфармаванай цытатай *"Дурны мужык, як варона!"* Ф. Багушэвіча. І нават тое, што дзеўка *"гонар мае / і годнасьць ведае сваю"*, таксама працягвае купалаўскую традыцыю.

Не менш брутальным з'яўляецца і верш "Фэмінізм", у якім лірычны(ая) герой(іня) прадстаўляе свае бачанне сучаснасці, усе праявы якой з'яўляюцца брутальнымі і накіраванымі на абуджэнне нізкіх інстынктаў. Герой(іня) па-свойму сінтэзуе культуралагічныя праявы і атрымліваецца адно толькі слова — "блядства".

Фрэйдаўскае Libido і шматлікія лібідозныя пульсацыі прарываюцца ў вершы "Вочы". Вочы, якія паўтараюцца чатыры разы, з'яўляюцца ланцужком сувязі паміж мужчынамі і жанчынамі, але лірычны(ая) герой(іня) не праводзіць мяжы паміж імі — у транссэксуальнай паэзіі не абавязкова маля-

ваць нейкія межы — і таму нічым не абмежаванае лібіда рвецца на прастор, на шырокі прастор паэзіі Васіля Фірхольда.




На старонках зборніка можна пабачыць і розныя вынаходніцтвы ў форме вершаў. Напрыклад, у вершах "Аб шкодзе наркотыкаў" і "Я і ты" лёгка заўважыць традыцыі Джойса і літаратуры "плыні свядомасці".

Танатаідальны комплекс і дэканструкцыя гамераўскага метанаратыву ўскладняюць трансфармаваны дыскурс Адысея ў вершы "Як мы каталіся на слане". Прыгоды герояў у вантробах слана адпавядаюць мадэлі сусвету, якая належыць стваральніку Гамеру, і героі ўключаюцца ў антычную парадыгму "Адысей — Уліс — Эней", дапаўняючы яе ў "скарочаным" выглядзе. Такім чынам, парадыгма, якая змадэлявана ў вершы, з'яўляецца псеўданезакончанай: нягледзячы на знешнюю незавершанасць, кампазіцыя з'яўляецца цыклічнай.

Падводзячы вынікі, бачым, што апошні зборнік Васіля Фірхольда вельмі неаднародны па сваёй структуры, але кампазіцыйна пабудаваны так, каб дыяпазон тэматыкі быў стэрэаскапічным і шматгранным. Паэт дасягнуў гэтага: вершы сапраўды шматпланавыя, цытатныя адносна шырокага культуралагічнага кантэксту і дэканструктыўныя ў адносінах да шматслойных метанаратываў. У рамках постмадэрнісцкай традыцыі паэзія В. Фірхольда ўяўляецца цікавай і наследуе традыцыі вядомых постмадэрністаў (Ул. Сарокіна, Зм. Прыгава, Джэці[2] і іншых).




*Заўвагі рэдакцыі:*

1. Як, дарэчы, і памер верша, садраны ў Купалы, не кажучы пра перадапошні радок ("Няхай усё зь мяне рагочуць"), які гучыць сарамлівым рэхам вядомага трыялету Максіма Багдановіча.

2. (Адказвае Джэці:) Чырванею. Няўжо ж я сапраўды такая вядомая? Хаця гэта яшчэ зь якога боку паглядзець. У мяне ёсьць адна сяброўка, яна працуе крамніцай у гастраноме. Дык вось яна зусім ня ведае Сарокіна і Прыгава, а мяне ведае. Во як!

Уринотерапия. Как я ее понимаю.

# ☺ ☺ ☺ СТАРОНКА-ІНТЭРНАТ

ПОСИДИМ НА ПЯТКАХ

Хню №4

Выйшаў ужо 4-ы нумар часопіса нестандARTнага мастацтва, на гэты раз рускамоўны. Выдаўца абяцае, што наступным будзе 5-ы, але яго яшчэ няма.
E-mail: urla@tut.by ; vika_trenas@tut.by

Marabaka

НЕ СПЕШИТЕ ПОД НОЖ ХИРУРГА!



Зьмест: сюрэалісты, Цім Сабакін, Льюіс Кэрал, Хармс... Вельмі прыгожыя малюнкі.
Кантакту няма.

Врединa №2

ВДОХНИ, ЧТОБЫ ВОСКРЕСНУТЬ!

"Безыдейный журнальчик", однако с диалогизмом покруче Бахтина.
Контакт: Беларусь 220053 Минск, а/я 39.

Trumheim №4

В ПОМОЩЬ СТУДЕНТАМ

Нойзовый зин с литературным уклоном. Красивый.
Контакт: Тарасов Дмитрий, м-н 2, д. 42, кв. 85; г. Светлогорск, Гомельская обл., 247400, Беларусь.

Слово и Культура №1

О хлебе насущном.

Очень-очень серьёзное издание, которое, кажется, слишком сурово оценил Зьміцер Вішнёў.
Контакт: попробуйте через "ВМ".

ОТВЕЧАЯ НА "КВАРТИРНЫЙ ВОПРОС"

Look Ahead

Здесь печатают произведения — литературные и не очень. Но печатают.
Контакт: 231800 г. Слонім-2 п/с 27.

А пра астатніх пазьней. Тут вельмі важная, нават тэрміновая справа!

ЧИТАТЕЛИ ПРОСЯТ СОВЕТА

**15 числа в районе первого подъезда дома по адресу Калиновского 70 были оставлены лыжи. Нашедшего просьба вернуть за вознаграждение. Лыжи очень нужны для тренировок. Заранее благодарю.**
**Контактный телефон 263-68-90 .**

ЗАПОМНИТЕ —

Ага! Як бы яшчэ пра сябе не забыць!
Нашыя каардынаты: 220009, Менск, а/с 108
E-mail: buslik@tut.by; djeti@tut.by

ПАЧАКАЙЦЕ!
Ідзе падрыхтоўка
да выключэньня
кампутару.

# Windows

(невядома які,
але дакладна
пірацкі :)

ЦЯПЕР
МОЖНА
СПЫНІЦЬ ПАРА-
ВЫ РУХАВІК